# Прадмова

*Чэсць і слава табе, беларуская моладзь, паўстаючая з-пад беларускай саломенай страхі. Ты сама сваімі рукамі адбудуеш сабе і сваім патомкам лепшую і святлейшую будучыню. На бок з дарогі, панове і гаспада з Захаду і Усходу! Беларуская моладзь ідзе!*

Янка Купала

Моладзь заўсёды была самай дзейнай палітычнай і сацыяльнай сілай, галоўным чыннікам зменаў у грамадстве. Гістарычны досвед даказвае гэта. У ЗША ў канцы 1960-х — пачатку 1970-х гадоў амерыканская моладзь склала аснову ўдзельнікаў масавых акцый за адмену расавай сегрэгацыі і расізму, супраць вайны ў В’етнаме. Гішпанскія студэнты сваімі масавымі акцыямі грамадскага непадпарадкавання дабіліся ў 1970-я гады дэмантажу аўтарытарнага франкісцкага рэжыму і пазней не дазволілі путчыстам вярнуць краіну ў «новае Сярэднявечча». Мірныя рэвалюцыі ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў канцы 1980-х — пачатку 1990-х гадоў супраць савецкай акупацыі і камуністычнага дыктату былі немагчымыя без масавага чыну моладзі. Тое ж самае можна было бачыць у пачатку XXI стагоддзя ў Грузіі, Украіне, Малдове. У безнадзейным супрацьстаянні з камуністычным рэжымам на пекінскай плошчы Цяньаньмэнь у чэрвені 1989 г. стаялі і гінулі кітайскія студэнты, якія самаахвярна дабіваліся дэмакратычных пераменаў у краіне. Не будзе выключэннем і моладзь Беларусі, якая заўсёды была ў авангардзе руху за незалежнасць краіны, за сцверджанне дэмакратычнага ладу, за сацыяльныя пераўтварэнні ў грамадстве, за свабоднае развіццё роднай мовы і культуры.

Гісторыя беларускага маладзёвага руху налічвае ўжо амаль 200 гадоў. Ён пачаўся ва ўмовах расійскага панавання, з часу, калі пачалося фармаванне сучаснай беларускай нацыі, калі стварылася першая кагорта патрыятычна настроенай моладзі, якая здолела асэнсаваць галоўныя патрэбы беларускага народу, вызначыць тыя заданні, што паставіў перад беларусамі Час, а таксама шляхі іх дасягнення.

Станаўленне і развіццё маладзёвага руху ў найноўшай айчыннай гісторыі мае шмат агульнага з гістарычнымі лёсамі іншых народаў, якія працяглы час не мелі сваёй дзяржаўнасці і былі паняволеныя г.зв. «гістарычнымі нацыямі». Раўналежна з украінскай, чэшскай, польскай паступовай моладдзю маладыя беларусы змагаліся ў першых шэрагах за сваю нацыянальную незалежнасць.

Як і літоўцы, украінцы і латышы, яны актыўна супрацьстаялі дэнацыяналізацыі свайго народу, стваралі першыя адукацыйныя асяродкі на роднай мове выкладання, закладалі нацыянальныя бібліятэкі і чытальні, арганізоўвалі тэатральныя і харавыя гурткі, якія рабіліся найважнейшымі чыннікамі грамадскай кансалідацыі і нацыянальнага ўсведамлення народных мас.

Разам з тым сітуацыя ў Беларусі, тыя вонкавыя і ўнутраныя варункі, у якіх даводзілася дзейнічаць актывістам беларускага маладзёвага руху, істотна адрозніваліся ад сітуацыі ў суседзяў. Працэс крышталізацыі беларускай нацыі быў моцна запаволены шматлікімі войнамі і ваеннымі канфліктамі, з'яўленнем чарговых акупантаў, якія рушылі на беларускія землі то з усходу, то з захаду, прыносячы з сабой незлічоныя чалавечыя ахвяры, вялізныя матэрыяльныя разбурэнні і культурныя страты. Гэтаму перашкаджала мэтанакіраваная паланізацыя і русіфікацыя краю на працягу XVII—XX стагоддзяў. Суседнія паноўныя этнасы — расійцы і палякі — актыўна выкарыстоўвалі беларускі этнаграфічны матэрыял для развіцця сваёй высокай культуры. Многія ўраджэнцы краю, беларусы па паходжанні, выдатна праявілі сябе на ніве расійскай ці польскай культураў: Адам Міцкевіч, Станіслаў Манюшка, Фёдар Дастаеўскі, Міхаіл Глінка, Міхаіл Мікешын, Іосіф Казлоўскі, Іван Хруцкі… Гэты спіс можна працягваць доўга. У неспрыяльных умовах беларускі народ не паспяваў аднавіць свой дэмаграфічны і інтэлектуальны патэнцыял, паступова адстаючы ад суседзяў у палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці. Усё гэта негатыўным чынам адбівалася на нацыятворчых працэсах у краіне.

Беларускую этнаграфічную масу вызначалі аморфнасць нацыянальнага самаўсведамлення, невысокі ўзровень этнічнай кансалідацыі, адносна нізкі адукацыйны ўзровень, неразвітая сацыяльная структура грамадства, дзе абсалютную большасць складалі сяляне і былі слаба прадстаўленыя шляхецкі стан, гарадскі элемент і прадпрымальнікі. Усё XX стагоддзе працягваўся няўхільны працэс размывання беларускага этнасу ў першую чаргу пад уздзеяннем русіфікацыі. Пад уплывам дэнацыяналізавальнай ролі мясцовага клеру каталіцкай і праваслаўнай цэркваў значнай перашкодай у згуртаванні беларускага народу рабіўся яго этнаканфесійны дуалізм — калі беларусы-каталікі ўспрымалі сябе палякамі (асабліва заможная шляхта), а праваслаўныя беларусы — расійцамі.

Усведамляючы сваю місію, маладыя актывісты з імпэтам браліся за нацыянальную працу ў змаганні за палітычныя, сацыяльныя і культурныя правы свайго народу. Шырачы беларускую асвету, тэатральную і музычную справу, яны імкнуліся дагрукацца да сэрцаў сваіх суайчыннікаў, абудзіць іх да кансалідаванай грамадскай працы. І народ паступова абуджаўся ад спячкі, пачынаў варушыцца, усведамляць свае нацыянальныя і сацыяльныя інтарэсы, змагацца за іх.

Дзеячы беларускага маладзёвага руху канца XIX — пачатку XX стагоддзяў фактычна не мелі папярэднікаў, на даробак якіх можна было б абаперціся ў

сваёй працы. У гэты час варта згадаць прозвішчы ўсяго некалькіх асобаў са старэйшага пакалення свядомых беларусаў, якія па праве лічацца духоўнымі настаўнікамі і дарадцамі пачынальнікаў беларускага вызвольнага руху. Збольшага даводзілася рабіць усё ўпершыню, часам упоцемках, навобмацак, штораз памыляючыся, але свята верачы ў сваё прызначэнне — званароў беларускага Адраджэння.

Адраджэнне… Вельмі ёмкае і трапнае слова дзеля пазначэння аднаўлення беларускай нацыянальнай самасці, вяртання беларусаў у еўрапейскую цывілізацыйную і культурную прастору. Як і дзеячы еўрапейскага Рэнесансу, беларускія маладыя адраджэнцы ахоплівалі сваёй чыннасцю многія дзялянкі грамадска-палітычнай і культурнай працы. Калі гэтага вымагала справа, паэты і мастакі рабіліся дыпламатамі, выдаўцамі, прадпрымальнікамі, а каморнікі, бухгалтары ды інжынеры — журналістамі, бібліятэкарамі, настаўнікамі, тэатральнымі дзеячамі. Зразумела, што ўсё гэта было не ад дабра, а вынікала з браку прыдатных да такой справы працаўнікоў. Не было тады іншага выйсця — яны мусілі працаваць там, дзе было патрэбна, каб паступова крышталізаваць з рыхлай этнаграфічнай народнай масы мадэрновую нацыю.

Трагічным для Беларусі было XX стагоддзе — дзве сусветныя вайны, масавыя палітычныя рэпрэсіі, Чарнобыльская трагедыя. У выніку гэтых катаклізмаў беларуская нацыя панесла мільённыя чалавечыя страты, масавыя разбурэнні, зведала чужацкія ўладныя дыктатуры, гвалт і знявагу чалавечай і нацыянальнай годнасці. Але, разам з тым, у гэтых вельмі цяжкіх варунках беларускі народ здабываў свае права на самастойнае існаванне, на ўласную дзяржаўнасць, якая дапаможа беларусам стаць на трывалы грунт сацыяльнага і культурнага поступу.

Праз гісторыю беларускага маладзёвага руху канца XIX — першай паловы XX стагодзя (да 1939 г.) мы імкнемся адлюстраваць агульную гісторыю беларускага нацыянальнага руху, гісторыю антысавецкага супраціву, чыннасць нацыянальна-дэмакратычных арганізацый, галоўнай мэтай якіх было дасягненне палітычнай незалежнасці краіны і рэалізацыя дэмакратычных каштоўнасцяў. Праз гісторыю беларускага маладзёвага руху мы разглядаем пачатак станаўлення нацыянальнага школьніцтва, тэатру, музыкі, літаратуры, прэсы, кнігавыдавецтва ды іншых аспектаў грамадска-культурнай чыннасці. Наагул, без вывучэння гісторыі беларускага маладзёвага руху цяжка будзе да канца зразумець феномен станаўлення беларускай грамадзянскай супольнасці і сучаснай беларускай культуры.

Стары рымскі афарызм «Гісторыю пішуць пераможцы» вельмі прыдатны да нашай сітуацыі, якая тычыцца гістарыяграфіі беларускага маладзёвага руху. Пра станаўленне і развіццё камсамолу і піянерыі ў СССР за 70 гадоў існавання савецкай улады напісаныя тысячы манаграфій, артыкулаў, выдадзеная вялікая колькасць дакументальных зборнікаў і ўспамінаў актывістаў камуністычнага руху. Цяпер яны пыляцца незапатрабаванымі ў кнігасховішчах, і мала хто жадае звярнуцца да гэтай літаратуры, каб

успомніць, напрыклад, сваю камсамольскую маладосць. І не таму, што ўсё напісанае ў іх — няпраўда. Найчасцей, ва ўмовах тагачаснай палітычнай цэнзуры, праўда ў гэтых «сведчаннях» максімальна выпрашчаная і дазіраваная небяспечнымі для тагачаснага ладу дозамі сапраўднай інфармацыі. Многія факты з гэтых выданняў настолькі перакручаныя, што ўжо цяжка аддзяліць ману ад ісціны.

Зусім адваротная сітуацыя з адлюстраваннем у навуковай і навукова-папулярнай літаратуры чыннасці беларускіх нацыянальна-дэмакратычных суполак, згуртаванняў і асацыяцый. Гэты чын у савецкі час, за малым выняткам, ніколі не быў асобнай тэмай даследаванняў. Можна ўзгадаць толькі кароткія гістарычныя агляды па гэтай праблематыцы Язэпа Найдзюка (у кнізе «Беларусь учора і сяньня»), Станіслава Станкевіча (у часопісе «Студэнцкая думка») і Станіслава Грынкевіча (даследаванне апошняга, агучанае 6 снежня 1926 г. у сценах Познанскага ўніверсітэта імя А. Міцкевіча для сябраў тамтэйшага ўкраінскага студэнцкага гуртка, на жаль, не было апублікавана).

Пачынаючы з канца 1980-х гадоў сітуацыя пастунова змянялася: у часопісах і энцыклапедычных выданнях пачалі з'яўляцца артыкулы і публікацыі, прысвечаныя чыннасці беларускіх вучнёўскіх і студэнцкіх арганізацый у Беларусі й па-за яе межамі. Трэба тут згадаць даследаванні, прысвечаныя гэтай тэме, такіх даследнікаў, як Аляксандра Гесь, Юры Васілеўскі-Чудзін, Андрэй Вашкевіч, Алена Глагоўская, Вячаслаў Даніловіч, Генадзь Каханоўскі, Віталь Крывуць, Ігар Лялькоў, Уладзімір Серпухаў, Анатоль Сідарэвіч, Алесь Смалянчук, Ніна Стужынская, Андрэй Чарнякевіч, Эрык Екабсонс і некаторыя іншыя. Важнымі крыніцамі ў вывучэнні гісторыі беларускага маладзёвага руху робіцца мемуарыстыка: апублікаваныя ў гэты час успаміны актывістаў беларускіх студэнцкіх арганізацыяў у БССР Макара Выдрыцкага і Міхаіла Ганчарыка, дзеячоў нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі Янкі Багдановіча, Надзеі Шнаркевіч, Янкі Шутовіча, Марыяна Пецюкевіча, перавыдадзеныя паваеннай эміграцыяй мемуары Яўхіма Кіпеля, Апалоніі Савёнак-Раткевіч, Язэпа Гладкага ды шэрагу іншых. Няма сэнсу пералічваць тут найважнейшыя бібліяграфічныя пазіцыі па згаданай тэматыцы. Яны прадстаўленыя ў канцы даследавання, у агульным бібліяграфічным спісе.

У цэлым можна сказаць, што да гэтага часу дадзеная праблема пакуль што не стала аб'ектам глыбокага і ўсебаковага вывучэння ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. У беларускай навуковай літаратуры прадстаўленыя асобныя сюжэты па дадзенай праблематыцы, якія не прэтэндуюць на ўсебаковасць і глыбіню даследавання праблемы. Фактычна застаецца недаследаванай гісторыя беларускага маладзёвага руху падчас Першай сусветнай вайны 1914—1918 гг., польска-савецкага ваеннага супрацьстаяння. Што вельмі істотна — слаба вывучаныя новыя архіўныя крыніцы па абранай тэме, якія захоўваюцца ў архівах Беларусі, Расіі, Польшчы, Латвіі, Літвы, Украіны ды іншых краін. Гэта тычыцца ў першую чаргу збораў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску, Беларускага дзяржаўнага

архіва-музея літаратуры і мастацтва, Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці, дзе пасля 1993 г. былі адкрытыя для шырокага доступу раней засакрэчаныя фонды Беларускага студэнцкага саюза, Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры ў Вільні, Беларускага культурна-асветнага таварыства ў Барысаве і шэраг іншых.

Дадзенае даследаванне павінна запоўніць наяўны прагал па гэтай праблеме. Яно прадстаўлена на суд чытача ў выглядзе навукова-папулярнага нарыса і папярэднічае навуковай манаграфіі па згаданай тэме, якую аўтар плануе выдаць праз нейкі час.

Аб'ектам дадзенага даследавання з'яўляецца гісторыя беларускага маладзёвага руху ў 2-й палове XIX ст. — першай палове XX ст.

Прадмет даследавання — чыннасць беларускіх нацыянальна-дэмакратычных маладзёвых арганізацый, узрост сяброў якіх — ад 14 да 29 гадоў, у перыяд ад 1864 г. да 1939 г. (да пачатку Другой сусветнай вайны).

У манаграфіі, напісанай у форме навукова-папулярнага нарыса, разглядаецца грамадска-палітычная і культурна-асветная праца беларускіх маладзёвых суполак і згуртаванняў у агульным кантэксце развіцця нацыянальна-вызвольнага руху і станаўлення грамадзянскай супольнасці ў Беларусі. Робіцца спроба адлюстраваць ролю маладзёвага руху ў нацыятворчых працэсах і ў станаўленні беларускай дзяржаўнасці.

Шматаспектнасць прадмету даследавання патрабуе рэалізацыі наступных задач:

- паказаць працэс нацыянальнага ўсведамлення беларускай моладзі і далучэння яе да нацыянальнага руху на мяжы XIX — XX стст.;
- выявіць галоўныя напрамкі палітычна-ідэалагічнай арыентацыі ў беларускім маладзёвым руху;
- абазначыць асноўныя формы і сродкі працы, якія выкарыстоўвалі актывісты беларускіх маладзёвых гурткоў дзеля грамадска-палітычнага згуртавання тутэйшага жыхарства і пашырэння сярод яго нацыянальных ідэяў;
- адзначыць уклад актывістаў беларускіх маладзёвых арганізацый у развіццё беларускага школьніцтва, тэатральнага і музычнага мастацтва Беларусі;
- паказаць ролю маладзёвых нацыянальных арганізацый у змаганні і супрацьдзеянні нямецкай і польскай акупацыйнай уладзе ў 1918—1921 гг.;
- адзначыць значэнне чыннасці беларускіх маладзёвых арганізацый ў Савецкай Беларусі ў справе пашырэння і паглыблення палітыкі беларусізацыі ў 1920-я гады;
- выявіць і прааналізаваць праявы палітычнага супраціву беларускага маладзёвага руху савецкаму рэжыму і яго адэптам-крэатурам — камсамолу і піянерыі;
- паказаць наступствы для беларускага маладзёвага руху масавых палітычных рэпрэсій з боку бальшавіцкага рэжыму;

- разгледзець асаблівасці развіцця беларускага маладзёвага руху ў Заходняй Беларусі ў міжваенны час;
- асэнсаваць значэнне чыннасці беларускіх маладзёвых асяродкаў у фармаванні нацыянальнай інтэлектуальнай эліты.

Важна падкрэсліць, што ў шэрагах беларускіх нацыянальных арганізацый былі не толькі этнічныя беларусы. Тут мы таксама бачым этнічных габрэяў, літоўцаў, немцаў, палякаў, расійцаў, татар, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў. Беларускі вызвольны рух — занадта шырокая з'ява, каб акрэсліваць яго рамкамі этнакультурнага нацыяналізму. Беларускі патрыятызм атаесамляецца не толькі з беларускім этнасам, а з усімі этнічнымі супольнасцямі, што разам стала жывуць на гэтай зямлі не адно стагоддзе. Беларускі патрыятызм — гэта непарыўная повязь з беларускай гістарычнай і культурнай традыцыяй, якая склалася ва ўмовах нацыянальнай і рэлігійнай талерантнасці. Беларускі патрыятызм — гэта жаданне свабоды, гэта змаганне за свабоду ўсіх грамадзян краіны не зважаючы на іх этнічнае паходжанне і веравызнанне.

У дадзеным даследаванні разгляд гісторыі беларускага маладзёвага руху не абмяжоўваецца толькі геаграфічнымі рамкамі Беларусі. У кнізе таксама разглядаецца чыннасць беларускіх маладзёвых і студэнцкіх арганізацый па-за межамі беларускай этнаграфічнай прасторы — у краінах блізкага і далёкага замежжа.

Нарыс пабудаваны паводле праблемна-храналагічнага прынцыпу і падзелены на 5 тэматычных блокаў, якія адпавядаюць агульнапрынятай перыядызацыі новай і найноўшай гісторыі Беларусі:

- пачатак беларускага маладзёвага руху, які ахоплівае перыяд з 2-й паловы XIX ст. і да пачатку Першай сусветнай вайны (1914 г.);
- чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый падчас глабальнага ваеннага канфлікту 1914—1921 гг., якая ахоплівае перыяд Першай сусветнай вайны, час нямецкай акупацыі 1915—1918 гг., польска-савецкай вайны 1919—1921 гг. (да падпісання Рыжскай мірнай дамовы);
- праца беларускіх маладзёвых асяродкаў ва ўмовах бальшавіцкага рэжыму (у геаграфічным аспекце гэты раздзел ахоплівае тэрыторыю БССР, а таксама Савецкай Расіі і іншых саюзных рэспублік, дзе дзейнічалі беларускія вучнёўскія і студэнцкія арганізацыі і зямляцтвы);
- дзейнасць беларускіх маладзёвых палітычных асяродкаў, студэнцкіх і вучнёўскіх арганізацый у Заходняй Беларусі;
- грамадска-палітычная і культурна-асветная чыннасць беларускай студэнцкай моладзі ў Латвіі, Літве, Польшчы, Чэхаславаччыне, Нямеччыне, Бельгіі і іншых краінах Еўропы (1900—1939 гг.).

Абраная структура працы шмат у чым абумоўленая асаблівасцямі гістарычнага развіцця Беларусі і беларускага нацыянальна-вызвольнага руху: адсутнасць да 1991 г. уласнай рэальнай дзяржаўнасці, прыналежнасць беларускіх этнічных земляў да розных дзяржаўных і адміністрацыйна-тэрытарыяльных утварэнняў, выключна складаны генэзіс нацыянальнага самаўсведамлення тутэйшага жыхарства. Гэтым, напрыклад, тлумачыцца той факт, што развіццё белару-

скага маладзёвага руху пачалося не на тэрыторыі самой Беларусі, а па-за яе межамі — у Пецярбургу, Маскве, Кіеве, Тарту, Варшаве, Кракаве, Празе — там, дзе былі ўніверсітэты і іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы, гэтыя сапраўдныя «выспы» вольнай думкі і поступу, дзе навучалася шмат ўраджэнцаў беларускага краю, пазбаўленага пасля падаўлення антырасійскага паўстання 1863—1864 г. вышэйшай школы. Іншы прыклад: у дадзеным даследаванні чыннасць беларускіх студэнцкіх і вучнёўскіх гурткоў у Заходняй Беларусі і беларускай частцы Латгаліі ў 1921—1939 гг. выдзеленая ў асобны тэматычны блок і непасрэдна не прывязаная да гісторыі беларускіх маладзёвых арганізацый за кардонам (у Польшчы і Латвіі).

Падчас напісання работы былі выкарыстаныя дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску, Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Дзяржаўнага архіва Мінскае вобласці, Архіва актаў новых у Варшаве, рукапіснага аддзела Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.

Манаграфія багата аздобленая ілюстрацыйным матэрыялам — звыш 200 фотаздымкаў і сканаваных дакументаў, якія былі выяўленыя ў зборах беларускіх, літоўскіх, польскіх і расійскіх архіваў, музеяў і бібліятэк. Многія з гэтых матэрыялаў візуальнага характару друкуюцца ўпершыню. У кнізе таксама выкарыстаныя 2 гістарычныя карты, распрацаваныя і ўкладзеныя аўтарам даследавання з дапамогай дачкі, Ляхоўскай Вольгі.

Аўтар выказвае шчырую падзяку за дапамогу ў падрыхтоўцы манаграфіі Віктару Астрогу, Ноне Васілеўскай, Андрэю Вашкевічу, Таццяне Воранавай, Вінцуку Вячорку, Аляксандры Гесь, Аляксею Глушко, Ганне Запартыцы, Таццяне Іваноўскай, Міхасю Казлоўскаму, Ірыне Каранкевіч, Таццяне Кекелевай, Вікторыі Конан-Труцько, Ірыне Макарэвіч, Аляксандру Пашкевічу, Надзеі Саўчанцы, Вячаславу Селяменеву, Ніне Стужынскай, Валянціне Цітавец і Андрэю Чарнякевічу. Асаблівая падзяка навуковаму рэдактару Анатолю Сідарэвічу за каштоўныя заўвагі і ўдакладненні, а таксама гісторыкам Юрасю Юркевічу і Андрэю Мастыку за магчымасць выкарыстання ў кнізе ілюстрацыйных матэрыялаў з Літоўскага цэнтральнага дзяржаўнага архіва ў Вільні.

Аўтар выказвае таксама вялікую ўдзячнасць за арганізацыйнае садзейнічанне ў зборы матэрыялаў і працы над кнігай падчас навуковай стажыроўкі ў Польшчы ў рамках Узнагароды імя Л. Сапегі дырэктару Вышэйшых курсаў Усходняй Еўропы Варшаўскага ўніверсітэта Яну Маліцкаму, дырэктару Усходняга Інстытута Познанскага ўніверсітэта імя А. Міцкевіча прафесару Кшыштафу Пяткевічу і супрацоўніку беларускай рэдакцыі «Радыё Палонія» ў Варшаве Змітру Новікаву.